PolotskSU



УДК 94(476)«19/20»

# «УСЕРДИЕ К ЛАТИНСТВУ»: СУПРАЦІЎЛЕННЕ ПЕРАВОДУ Ў ПРАВАСЛАЎЕ Ў ПАДЗВІНСКІМ РЭГІЁНЕ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

*М.М. КАРОЛЬ*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

*У артыкуле разглядаецца працэс пераводу каталіцкага (і былога ўніяцкага) насельніцтва ў праваслаўе ў другой палове XIX ст., а таксама рэакцыя на яго. Акрэсліваюцца галоўныя цэнтры Падзвінскага рэгіёна, дзе нежаданне пераходу выявілася асабліва актыўна і ў якіх пасля назіраўся дастаткова масавы рух за вяртанне ў каталіцызм. Прасочаны шляхі захавання каталіцкім насельніцтвам ранейшай канфесійнай ідэнтычнасці. Аналізуецца сітуацыя, якая склалася ў рэгіёне пасля прыняцця ўказа аб верацярпімасці ад 17 красавіка 1905 г. Асобная ўвага звернута на дынаміку міжканфесійных пераходаў, іх тэрытарыяльнае размяшчэнне, а таксама рэакцыю праваслаўнага духавенства на вяртанні ў каталіцызм пасля 1905 г.*

***Ключавыя словы:*** *рэлігійная канверсія, праваслаўе, каталіцызм, празелітызм, канфесійная ідэнтычнасць, сялянства, Віцебская губерня, Дрысенскі павет.*

У сучасным беларускім грамадстве адбываецца ўзрастанне цікаўнасці да аспектаў, звязаных з рэлігійным мінулым краіны. Важнае значэнне набывае неабходнасць аб’ектыўнага адлюстравання рэлігійных працэсаў, якія адбываліся на тэрыторыі сучаснай Беларусі, у тым ліку, прыктыкі пераводу насельніцтва з каталіцызму ў праваслаўе ў другой палове XIX ст. – пачатку XX ст. Адным з ключавых момантаў пры вывучэнні дадзенай праблематыцы з’яўляецца праблема захавання каталіцкім і былым уніяцкім насельніцтвам сваёй рэлігійнай ідэнтычнасці.

Пасля падаўлення паўстання 1863-1864 гг. на тэрыторыі беларускіх губерняў ўладамі была распачата кампанія, накіраваная на мінімізацыю польскага нацыянальна-культурнага ўплыву. У рэлігійным плане яна праяўлялася ва ўмацаванні ролі праваслаўнай царквы, якое ажыццяўлялася, сярод іншага, з дапамогай закрыцця каталіцкіх парафій,ператварэння касцёлаў у праваслаўныя цэрквы, змяншэння колькасці кліру і, асабліва, пераводу насельніцтва з каталіцтва ў праваслаўе. Менавіта пасля паўстання 1863-1864 гг. гэтая палітыка пачынае набываць мэтанакіраваны і паслядоўны характар.

Афіцыйная пазіцыя праваслаўнай царквы заключалася ў падкрэсленні, у першую чаргу, неабходнасці наяўнасці добраахвотнага намеру чалавека перайсці з каталіцызму ў праваслаўе. Пры пераводзе не павінны былі прымяняцца метады гвалту або запалохвання, гэтай мэты можна было дасягаць толькі «шляхам развражлівых перакананняў, прапанаваных ім у духу пакоры і любові хрысціянскай, але зусім не дакорамі і гвалтам» [1, арк. 2]. Аднак на практыцы гэта ўмова выконвалася далёка не заўсёды.

PolotskSU



Па ўспамінах сучаснікаў пасля ліквідацыі ў 1839 г. уніі і пераводу ў праваслаўе былое ўніяцкае насельніцтва беларускіх губерняў працягвала наведваць касцёл, не сустракаючы перашкод з боку расійскай адміністрацыі або праваслаўных святароў. Ксяндзы таксама без наступстваў маглі здзяйсняць абрады па правілах каталіцкай веры, калі да іх звярталіся з такімі просьбамі былыя уніяты. Але пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. сітуацыя карэнным чынам змянілася. Мешчанін горада Лепель Даніла Сцяпанаў успамінаў, што менавіта пасля паўстання сталі забараняць хадзіць у касцёл. Часам на ўваходзе ў яго стаялі жандары, якія прапускалі толькі прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя, а простых сялян накіроўвалі ў праваслаўную царкву. Пасля падаўлення паўстання ксяндзы ў большасці выпадкаў сталі адмаўляць просьбам былых уніятаў правесці хрышчэнне, шлюб або пахавальны абрад [2, с. 350].

На асаблівым кантролі ва ўладаў былі святочныя набажэнствы ў касцёлах, на якія збіраліся шмат людзей. На святочнай імшы ў касцёле мястэчка Ула Лепельскага павета ў кастрычніку 1866 г. салдаты і жандары перашкаджалі ўваходу праваслаўных у касцёл, забіралі ў іх малітоўнікі на польскай мове [3, арк. 2]. Улады сцвярджалі, што ўльскі ксёндз наўмысна адкрыў іншыя дзверы за алтаром, каб даць магчымасць праваслаўным увайсці ў храм. У сваю чаргу, мясцовы праваслаўны святар заявіў, што большая частка тых, хто быў на свяце, з'яўляюцца вернікамі яго царквы, але ніколі не бываюць на споведзі і наведваюць для гэтых мэтаў касцёл. Ксяндзы, аднак, адмаўлялі абвінавачванні ў патуранні фармальна праваслаўным у наведванні каталіцкага храма [3, арк. 4]. Як бачым, нават праваслаўны святар адзначаў, што значная частка яго прыхаджан фактычна прытрымлівалася каталіцкіх абрадаў.

З 1863 па жнівень 1866 гг. ва ўсіх беларускіх губернях у каталіцызм было пераведзена каля 42 тысяч чалавек, з іх у Віцебскай губерні больш за 2 тысячы [4, арк. 24]. У цэлым, палітыка па «вяртанні» каталікоў у праваслаўе адразу ж сустрэла супраціўленне з боку насельніцтва. Адзначым, што пратэст насіў пераважна мірны характар, людзі спрабавалі застацца ў каталіцтве пры дапамозе адміністрацыйных працэдур (напісанне рознага кшталту прашэнняў ў царкоўныя і свецкія інстанцыі). Пры немагчымасці вырашэння пытання законным шляхам былыя каталікі звярталіся да канфесійнай «унутранай эміграцыі», калі пры вонкавым прыняцці праваслаўнай веры, яны працягвалі наведваць касцёл, а ў выпадку адмовы з боку ксяндзоў, самастойна выконвалі абрады па правілах каталіцкай веры [5, с. 265].

Паказальным у гэтых адносінах з'яўляецца прыклад Росіцкай парафіі Дрысенскага павета. У 1867 г. мясцовы праваслаўны святар падаў спіс з 35 фармальна праваслаўных вернікаў, якія раней далі падпіскі са згодай наведваць праваслаўную царкву, але затым працягвалі хадзіць на набажэнствы ў касцёл і здзяйсняць каталіцкія абрады [6, арк. 1]. Святар адзначаў, што ўсе яны не былі «прыроднымі каталікамі», а пасля ліквідацыі уніі ў 1839 г. самавольна перайшлі ў «лацінства». З іх толькі адзін селянін вёскі Малыя Клескі перад смерцю вярнуўся ў праваслаўе, астатнія ж «застаюцца ў зацятасці і не прадбачыцца надзеі на зварот іх у праваслаўе» [6, арк. 2].

Яшчэ адным спосабам захавання традыцыйнай каталіцкай рэлігійнасці нават пасля фармальнага прыняцця праваслаўя з’яўлялася імкненне ахрысціць сваіх дзяцей

PolotskSU



у касцёле, тым самым надаючы ім легальную магчымасць дабівацца прызнання іх каталікамі. Клір Таболкаўскай царквы Дрысенскага павета паведамляў у органы мясцовай адміністрацыі, што ксёндз Забельска-Валынецкага касцёла незаконна ахрысціў дачку селяніна Фёдара Спірыдава Паўліну. Сам Ф. Спірыдаў быў адным з «тых, хто спакусіўся ў лацінства». У 1856 г. ён абвянчаўся ў Таболкаўскай царкве, але пасля гэтага наведваў толькі касцёл і лічыў сябе каталіком [7, арк. 3]. Пробашч касцёла ў вёсцы Ляшчылава Дрысенскага павета ахрысціў Венядзікта – сына селяніна Юстыніянаўскай валасці Аляксандра Паўлавіча Бурачонка, які лічыў сябе каталіком. Пры гэтым фармальна пасля разбору паствы паміж каталіцкімі і праваслаўнымі прыходамі ў 1842 г. дадзены селянін адносіўся да праваслаўных [7, арк. 4].

Пры гэтым улады адмаўлялі сялянам у здольнасці па сваёй волі адстойваць каталіцкую канфесійную ідэнтычнасць і шукалі «падбухторшчыкаў», вінаватых у адпадзенні сялян ад праваслаўнай веры [8, с. 166]. Сапраўды, нярэдка ксяндзы адмоўна ставіліся да кантактаў сваіх вернікаў з праваслаўнымі (адмаўляліся здзяйсняць змяшаныя шлюбы, выдаваць неабходныя дакументы), але мясцовая адміністрацыя імкнулася прадставіць іх галоўнымі адказнымі за супраціўленне сялян пераводу ў праваслаўе. Так, у рапарце ад 6 сакавіка 1867 г. судовы следчы Полацкага павета дакладваў аб святарах касцёлаў у вёсках Гарбачэва і Сакалішча, якія «спакушалі з праваслаўя» ў каталіцызм сялян [9, арк. 1].

Акрамя таго, падчас складання спісу прыхаджан-каталікоў міравы пасрэднік з размоў з мясцовымі жыхарамі даведаўся, што многія сяляне нават пасля фармальнага прыняцця праваслаўя пасля скасавання ўніяцкай царквы прытрымліваліся каталіцкай веры, некаторыя хрысцілі дзяцей у ксяндзоў або перахрышчвалі ў касцёлах, пры гэтым даючы ім новыя імёны. Шмат сялян апынулася неўнесенымі ў спісы каталіцкіх парафій, але яны працягвалі наведваць касцёл і звяртацца за трэбамі да ксяндзоў [9, арк. 1 адв.].

У выпадках, калі сяляне самі звярталіся да ўладаў з прашэннямі аб вяртанні ў каталіцызм, паліцэйскія органы ўсё роўна спрабавалі знайсці «падбухторшчыкаў» складання прашэнняў. Напрыклад, ў 1876 г., калі такі запыт у чарговы раз падалі сяляне Стрыжынскай валасці Дрысенскага павета, мясцовы павятовы спраўнік даў указанне высветліць абставіны напісання прашэння на прадмет дзейнасці патэнцыйных «падбухторшчыкаў» [10, арк. 1]. Сам факт напісання такога прашэння ацэньваўся мясцовай адміністрацыяй як «вельмі шкодны», які «адгукнецца на агульным настроі масы былога ўніяцкага насельніцтва і, па чутках, [можа стаць] і заразным прыкладам». Спраўнік адзначаў, што правілы праваслаўнай царквы яшчэ не ўкараніліся ў «іх маларазвітым асяроддзі, а польская рымска-каталіцкая прапаганда і да гэтага часу не спыняецца» [10, арк. 3 адв.]. У выніку «падбухторшчыкамі» былі прызнаны мясцовыя каталіцкія святары, сярод іх ксёндз Асвейскага касцёла Ярaслаўскі [10, арк. 7].

Разглядаючы выпадкі гвалтоўнага далучэння да праваслаўя, варта адзначыць, што толькі ў выключных выпадках падаўцы прашэнняў маглі даказаць неправамернасць свайго пераводу з каталіцызму. Людзі, якія імкнуліся вярнуцца ў ранейшае веравызнанне, часта апелявалі да таго, што яны былі далучаны гвалтоўна да праваслаўя ці ўвогуле не ведалі пра тое, што іх запісалі праваслаўнымі. Расійская адміністрацыя

PolotskSU



вельмі рэдка разглядала такія справы, бо існавала негалоснае правіла не даваць такім прашэнням ніякага ходу для далейшага разгляду ў вышэйшых інстанцыях. Але існавалі і выключэнні, калі выпадкі парушэння ўласна расійскага заканадаўства былі настолькі відавочныя, што іх нельга было ігнараваць.

У 1864 г. віцебскаму губернатару былі прадстаўлены 200 падпісак сялян Горсплянскай і Стаспольскай сельскіх грамадаў Полацкага павета аб жаданні перайсці з каталіцызму ў праваслаўе. У сувязі з гэтым было загадана праверыць і прыняць меры супраць людзей, якія могуць перашкодзіць сялянам здзейсніць пераход [11, арк. 1]. Аднак высветлілася, што мясцовы пісар Тэйх падманам атрымаў гэтыя падпіскі, а самі сяляне ніколі не выказвалі жадання далучыцца да праваслаўя.

Па праведзеным дазнанні сяляне Горсплянскай і Стаспольскай грамадаў за некалькі месяцаў да гэтага прысутнічалі на сходзе для складання дамовы аб наборы ў рэкруты. Пасля яго заканчэння пісар Тэйх загадаў прыкласці пячатку да напісанага дакументу, не патлумачыўшы яго зместу, а затым абвясціў, што ўсе прысутныя з гэтага часу праваслаўныя і павінны хрысціцца «па-руску», чаго сяляне спачатку не зразумелі і разышліся па дамах. Усё гэта пацвердзілі старшыны і сяляне, не толькі каталікі, але і праваслаўныя [11, арк. 60]. Верагодна, пісар Тэйх, ведаючы пра няўдалыя спробы святара Горсплянскай царквы Ніла Каўганкіна далучыць гэтых сялян да праваслаўя, вырашыў скарыстацца іх непісьменнасцю, каб заслужыць сабе ўзнагароду.

Святар Н. Каўганкін, у сваю чаргу, не праверыў добраахвотнасць такога далучэння, а каб хутчэй замацаваць поспех, адразу паведаміў пра гэта свайму духоўнаму начальству. І таксама звярнуўся да настаяцеля бліжэйшага Гарбачэўскага касцёла, каб той выключыў сялян са спісу прыхаджан сваёй парафіі.

У ходзе следства было высветлена, што падпіскі сялян Горсплянскай і Стаспольскай грамадаў былі насамрэч складзеныя пісарам Тэйхам без жадання і ведама саміх сялян, пра што засведчылі 93 праваслаўныя, 17 каталікоў, 7 сельскіх старастаў і ўласна пісар Тэйх, які на следстве прызнаўся у падробцы подпісаў [11, арк. 20 адв.]. У выніку за злоўжыванне службовым становічшам пісар Тэйх быў звольнены, справа перададзена ў суд, а наяўныя падпіскі было загадана ў прысутнасці сялян спаліць.

Выпадкі, калі сяляне здолелі даказаць, што добраахвотна не давалі падпісак аб далучэнні да праваслаўя, з'яўляюцца вельмі рэдкімі. Звычайна пры разглядзе скаргаў на гвалтоўны характар далучэння расійская адміністрацыя не правярала добраахвотнасць гэтага акта, а апелявала толькі да наяўнасці падпіскі і сведчаннаў мясцовага святара. Магчыма, істотную ролю ў справе сялян Полацкага павета адыгралі паказанні, якія давалі не толькі пераведзеныя каталікі, але і іх праваслаўныя аднавяскоўцы і старасты.

Здаралася, што сяляне скардзіліся на прымяненне фізічнай сілы з боку мясцовых свецкіх уладаў. У снежні 1871 г. сяляне вёскі Мамонаўшчына Дрысенскага павета падавалі скаргу на дзеянні начальства. Яны сцвярджалі, што іх зачынялі ў мароз у падвалах і збівалі, пакуль яны не пагодзяцца прыняць праваслаўе [12, арк. 1].

Вышэйзгаданыя факты дазваляюць казаць аб заканамернасці тэндэнцыі, якая выявілася пасля выдання ўказа аб верацярпімасці ад 17 красавіка 1905 г. Дастаткова

PolotskSU



масавае вяртанне насельніцтва беларускіх губерняў з праваслаўя ў каталіцызм стала лагічным завяршэннем шматгадовай барацьбы за сваю рэлігійную ідэнтычнасць. Больш за тое, яшчэ да 1905 г., фармальна з'яўляючыся праваслаўнымі, многія з іх захоўвалі сваю каталіцкую ідэнтычнасць і імкнуліся перадаць яе сваім дзецям.

У выніку, калі быў выдадзены ўказа ад 17 красавіка 1905 г., які стварыў прававыя магчымасці для выхаду з праваслаўя, у па Віцебскай губерні (па стане на 1909 г.) у каталіцызм вярнулася 3815 чалавек, з іх у беларускіх паветах 2692 чалавекі (гл. Табліцу 1) [13, арк. 29][1].

Табліца 1. – Колькасць асоб, якія перайшлі з праваслаўя ў каталіцызм па асобных паветах Віцебскай губерні за 1905–1909 гг.

| Павет | 1905–1906 | 1907 | 1908 | 1909 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|
| Віцебскі | 2 | 74 | 15 | 27 | 118 |
| Гарадоцкі | – | 10 | – | – | 10 |
| Лепельскі | – | 22 | 3 | 24 | 49 |
| Полацкі | 5 | 65 | 35 | 17 | 122 |
| Дрысенскі | 2210 | 61 | 74 | 48 | 2393 |

Крыніца: [13, арк. 29 адв.].

Матэрыялы, якія назапашваліся ў канцылярыі віцебскага губернатара, дазваляюць вылучыць канкрэтныя мікрарэгіёны (перш за ўсё, воласці), дзе назіралася найбольшая колькасць жадаючых перайсці ў каталіцызм. У Дрысенскім павеце гэта Асвейская, Замошская, Каханавіцкая, Сар’янская, Сушкоўская, Таболкаўская і Юстыніянаўская; у Полацкім павеце – Арцейкавіцкая і Петрапаўлаўская; у Лепельскім павеце – Вароніцкая і Кубліцкая воласці [15; 16].

Улады вылучалі некалькі прычын, чаму адбыліся такія масавыя пераходы, асабліва на тэрыторыі Дрысенскага павета. Па-першае, яны ўсведамлялі той факт, што ў 1860-я гг., калі пачаўся масавы перавод насельніцтва ў праваслаўе, каталікі і былыя ўніяты маглі без свайго ведама прыпісвацца да праваслаўных. Па-другое, сцвярджалася, што ў рэгіёне маецца вялікая колькасць каталіцкіх прыходаў і адчуваецца недахоп праваслаўных прыходаў[2].

Таксама важнае значэнне надавалася асабістым перакананням, стасункам і ўплывам. Як і раней, у пачатку ХХ ст. было распаўсюджана меркаванне, што былых уніятаў каталіцызм вабіць «гучным арганам, лёгкімі пастамі і магчымасцю ўступаць ў блізкароднасныя шлюбы», якія адмаўляліся здзяйсняць праваслаўныя святары [13, арк. 29 адв.]. Сваю ролю адыгравалі і міжасабовыя стасункі, калі праваслаўныя і каталікі маглі быць родзічамі і часта ўдзельнічаць у рэлігійных абрадах адзін аднаго (абрады хрышчэння, шлюбу, пахавання). Прыводзіліся аргументы аб тым, што каталіцкія ксяндзы

[1] Да 1913 г. іх колькасць павялічылася да 4911 чалавек [14, с. 180].
[2] Пры гэтым пасля паўстання 1863-1864 гг., частка касцёлаў закрывалася і ператваралася ў праваслаўныя цэрквы. Так, у 1865 г. былі ліквідаваны Шацілаўскі і Капцоўскі касцёлы ў Полацкім павеце, Сар’янскі, Баліна-Чурылаўскі і Ляшчылаўскі касцёлы ў Дрысенскім павеце [13, арк. 39-40].

PolotskSU



мэтанакіравана распаўсюджвалі «недарэчныя чуткі» аб тым, што царская сям'я прыняла каталіцзм, або аб тым, што цар абяцаў саслаць усіх праваслаўных у Сібір [13, арк. 30]. Відавочна, мясцовая адміністрацыя не да канца асэнсоўвала ўнутраныя прычыны дастаткова масавага пераходу ў каталіцызм і традыцыйна імкнулася звесці іх да ўплыву знешніх фактараў, перш за ўсё, разнастайных праяў «каталіцкай прапаганды», да якой у пачатку XX ст. прымешвалася «польскае пытанне» У 1913 г. Свяцейшы Сінод звяртаў увагу віцебскага губернатара на павелічэнне актыўнасці каталіцкага духавенства і «часткі палякаў», якія намагаюцца «апалячыць карэннае беларускае насельніцтва, якое належыла да лацінскай царквы, і спакушаюць у каталіцызм праваслаўных беларусаў» [13, арк. 28].

Праваслаўнае духавенства прапаноўвала прымаць меры для барацьбы з каталіцкім празелітызмам пры дапамозе распаўсюджвання лістовак, супольных харавых спеваў у прыходах, паляпшэння царкоўнай дысцыпліны. Асаблівая ўвага звярталася на місіянерскую дзейнасць, арганізацыю «кружков ревнителей православия», прыходскіх брацтваў, урачыстых публічных хросных хадоў, аказанне матэрыяльнай дапамогі тым, хто мае ў ёй патрэбу.

Выразны рух за вяртанне ў каталіцызм, які назіраўся ў Віцебскай губерні пасля 1905 г., сведчыць пра важнасць каталіцкай ідэнтычнасці для часткі фармальна праваслаўнага насельніцтва, якая здолела захаваць канфесійную тоеснасць насуперак адміністрацыйным захадам і перашкодам, якія ажыццяўляліся ў другой палове XIX ст. Нягледзячы на спробы ўлад звесці прычыны каталіцкай «ўпартасці» да ўплыву знешніх фактараў, такое трывалае ўсведамленне сябе каталікамі доказвае наяўнасць у беларускага сялянства Віцебскай губерні развітай рэлігійнай свядомасці.

ЛІТАРАТУРА

1. Дело по отношению Бобруйского уездного полицейского управления о наблюдении за аккуратным исполнением правил православной веры гражданином Иваном Кобардо с его детьми Александром и Осипом в Чернинском приходе вместо Горбацевичского. 08.05.1868–24.10.1868 // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 32260.
2. Шавельский Г. И. Последнее воссоединение с православною церковью униатов Белорусской епархии (1833–1839 гг.). – СПб. : Тип. «Сельского вестника», 1910. – XXIV, 380, 504 с.
3. Дело о посещении Ульского костела православными. 1866–1867 гг. // НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 32787.
4. Дело по отношению Виленской ревизионной комиссии о предоставлении сведений о присоединившихся к православию 1863–1866 гг. // НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 32744.
5. Кароль, М. М. Канфесійная «ўнутраная эміграцыя» сялянства Мінскай губерні як рэакцыя на палітыку русіфікацыі ў апошняй трэці XIX ст. / М. М. Кароль // Архіварыўс : зборнік навук. паведамленняў і арт. – Мінск : НГАБ, 2016. – Вып. 14. – С. 254–268.
6. Дело о перешедших в латинство прихожанах Росицкой церкви. 1867 г. // НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 33399.

PolotskSU



7. Дело о противозаконном крещении ксендзами Забельского, Волынецкого и Лещиловского костелов детей православных родителей. 1863 г. // НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 31250.
8. Кароль М. М. Супраціўленне пераводу ў праваслаўе каталіцкага насельніцтва беларускіх губерняў пасля паўстання 1863-1864 гг.: вобраз «падбухторшчыкаў» у расійскім афіцыйным дыскурсе / М. М. Кароль // «Долгий XIX век» в истории Беларуси и Восточной Европы: исследования по Новой и Новейшей истории : сб. науч. тр. – Минск : РИВШ, 2017. – С. 165–174.
9. Дело об уклонении прихожан Горбачевской церкви Полоцкого уезда в католицизм (1867 г) // НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 33510.
10. Дело по отношению Департамента духовных дел о предоставлении сведений по прошению крестьян Стрижинской волости Дриссенского уезда о дозволении исповедовать католицизм. 1876–1877 гг. // НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 35885.
11. Дело о переводе в православную веру 200 крестьян в Полоцком уезде. 23.02.1865–31.05.1866 // НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 31904.
12. Дело по отношению МВД о предоставлении сведений по жалобе крестьян деревни Мамоновщины Дриссенского уезда о нанесении им побоев и заключении в погребах за нежелание присоединиться к православию. 1871–1882 гг. // НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 35156.
13. Дело о принятии мер к прекращению перехода православных в католичество. 1882–1914 гг. // НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 54191.
14. Яноўская В. В. Хрысціянская царква ў Беларусі, 1863–1914 гг. – Мінск: БДУ, 2002. – 199 с.
15. Дело о переходе из православия в католицизм. 1907–1911 гг. // НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 47296.
16. Дело о переходе из православия в католицизм. 1909 г. // НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 47650.

## "ZEAL FOR THE LATINS": RESISTANCE TRANSLATION IN ORTHODOXY PODVINSKA REGION IN THE SECOND HALF OF XIX - EARLY XX CENTURY

*M. KAROL*

*His article is devoted to the process of conversion of the Catholic (and former Uniate) population to Orthodoxy in the second half of the XIX century as well as reactions to it. It outlines the main centres in Padzvinnie region where the reluctance of the conversion was particularly active and there was enough the mass movement for the return to Catholicism. The patterns of preservation of the Catholic population of the former confessional identity were traced. The situation in the region after the adoption of the decree on religious tolerance in 1905 was analyzed. Special attention is paid to the dynamics of interfaith conversions, their geographical location, social status and the reaction of the Orthodox clergy on return of the people to Catholicism after 1905.*

*Keywords: religious conversion, Orthodoxy, Catholicism, proselytizing, confessional identity, the peasantry, Vitebsk Province, Drissa uezd.*